# ФАРМІРАВАННЕ ВОБРАЗНАГА МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

**Лапіцкая Д.В.,**
студэнтка 2 курса псіхолага-педагагічнага факультэта

УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
Кафедра агульнаадукацыйных дысцыплін і методык іх выкладання
Навуковы кіраўнік – к. філал. н., дацэнт Канцавая Г.М.

Сёння ўменне думаць, гаварыць, разважаць, вобразна і правільна будаваць выказванне з'яўляецца важным складнікам вербальнага іміджу асобы, у сувязі з чым фарміраванне патэнцыялу маўлення вучня павінна пачынацца ўжо ў пачатковых класах.

Усе з'явы навакольнага свету ўпарадкоўваюцца ў чалавечай свядомасці дзякуючы сістэмнай арганізацыі, якая ўласціва ўсім узроўням мовы і яе шматлікім формам існавання. Трапляючы ў мастацкі кантэкст, слова ўключаецца ў складаную вобразную сістэму твора і набывае яркую эстэтычную афарбоўку.

Традыцыйна словы, які выкарыстоўваюцца ў пераносным значэнні з мэтай сварэння вобраза, называюцца тропамі. Тропы «пашыраюць магчымасці адлюстравання рэчаіснасці, павялічваюць сэнсавы дыяпазон слова, узмацняюць яго эмацыянальна-ацэначны фон, дапамагаюць вобразна і лаканічна вызначыць сутнасць з'явы, падзеі і выказаць свае адносіны да іх» [1, с. 307].

Аналіз сучасных падручнікаў па літаратурным чытанні для І ступені агульнай сярэдняй адукацыі паказаў, што асаблівая роля ў станаўленні моўнай асобы на пачатковым этапе навучання належыць метафары, эпітэту і параўнанню.

Метафара – гэта адзін з найважнейшых элементаў мастацкага маўлення. Яна вызначаецца як троп, які заключаецца ў выкарыстанні слоў і выразаў у пераносным значэнні на аснове падабенства, аналогіі і г. д. Метафара «робіць нагляднай нябачную карціну свету», стварае яе «моўную карціну, успрымальную за кошт вербальна-вобразных асацыяцый, якія ўзнікаюць са слоў і выразаў» [2, с. 180].

Асаблівасцю сучасных падручнікаў па літаратурным чытанні з'яўляецца тое, што тэрмін *метафара* не выкарыстоўваецца аўтарамі, але праводзіцца праца па разуменні метафарычнага выкарыстання слова. Працу над метафарай настаўнік будзе весці, напрыклад, пры вывучэнні верша Я. Коласа «Адлёт жураўлёў» (2 клас), папрасіўшы вучняў патлумачыць выразы *замірае лета, заціхаюць далі, сірацее рэчка, халадзеюць хвалі* і ўявіць сабе той вобраз, які малюе паэт у нашым уяўленні.

Звернемся таксама да верша А. Дзеружынскага «Летняя раніца» (3 клас). Настаўнік задае пытанні, скіроўваючы ўвагу вучняў на вобразнае апісанне карціны летняй раніцы. Напрыклад: Якімі словамі паэт апісвае летнюю раніцу? Як вы разумееце выразы *летняя раніца ветла ўсміхаецца, летняя раніца*

Репозиторий БрГУ

*спрытна ўвіхаецца*? Апішыце сваімі словамі летнюю раніцу, пра якую гаворыць паэт у гэтым вершы.

Акрамя метафары, у пачатковых класах вядзецца пастаянная праца, звязаная з выдзяленнем эпітэта і вызначэннем яго функцыі ў мастацкім тэксце. Эпітэт (грэч. epitheton ‘прыдатак’) – від тропа, мастацкае азначэнне, якое вобразна, эмацыянальна характарызуе чалавека, прадмет, жыццёвыя з’явы, падзеі. Эпітэты дапамагаюць пісьменнікам адлюстраваць свае пачуцці і перажыванні, адносіны да навакольнага свету [1, с. 345].

Пры вывучэнні ў 2 класе верша В. Жуковіча «Маладая восень» вучні выдзяляюць словы, з дапамогай якіх аўтар перадае сваю радасць ад незвычайнага малюнка ранняй восені, высвятляюць, чым для паэта так прыцягальны гэты час і чаму менавіта так, а не інакш паэт характарызуе восень, зачытваюць адпаведныя радкі з верша. Настаўнік просіць вучняў самастойна падабраць да слова *восень* прыметнікі, з дапамогай якіх можна эмацыянальна ахарактарызаваць гэтую пару года. Такі від працы садзейнічае развіццю назіральнасці, вобразнага мыслення.

Адной з формаў мастацкага мыслення, без якой не можа абысціся ні адна мова, з’яўляецца параўнанне. Параўнанне – адзін з мастацкіх тропаў, пры якім адбываецца прыпадабненне прадмета (ці з’явы) іншаму па якой-небудзь агульнай для іх прыкмеце. У структуры параўнання заўсёды ёсць тры лагічна неабходныя элементы: суб’ект параўнання (тое, што параўноўваецца), аб’ект параўнання (тое, з чым параўноўваецца) і аснова параўнання (агульная прымета дзвюх з’яў).

Разгледзім выкарыстанне гэтага тропа ў мастацкіх тэкстах. Знаёмячыся з вершам Я. Коласа «Песня аб вясне» (2 клас), вучні ўчытваюцца ў радкі «Звоніць, скача, як дзіцятка, гэты жэўжык-ручаёк, на яго, бы тая матка, сонца кідае свой зрок», высвятляюць, з якой мэтай аўтар выкарыстоўвае параўнанні, хто з кім параўноўваецца, і прыходзяць да вываду, што выкарыстаныя ў вершы параўнанні дапамагаюць чытачу лепш зразумець і ярчэй уявіць тое, што адлюстроўвае аўтар.

Замацаваць веды пра параўнанне дапаможа праца над вершам У. Мазго «Сябры вясны» (2 клас). Аналізуючы верш, малодшыя школьнікі адказваюць на наступныя пытанні: Якія прыметы вясны адлюстраваны ў вершы? З якім пачуццём паэт піша пра надыход вясны? Якія выразы дапамагаюць уявіць прыход вясны? Настаўнік звяртае ўвагу дзяцей на параўнанне (*нібы хлапчук, бяжыць раўчук у госці да вясны*), прапануючы малодшым школьнікам вызначаюць яго ролю ў тэксце.

У 3 класе вучні знаёмяцца з творам А. Русака «Мой край». Да гэтага тэксту ў падручніку прапануюцца наступныя пытанні Якія малюнкі вы ўяўляеце ў час чытання твора? Якія пачуцці трэба перадаць пры чытані гэтага твора?

Акрамя адказаў на пытанні, змешчаныя ў падручніку, настаўнік прапануе вучням паглядзець у тэксце, з чым параўноўвае А. Русак стагі на лугах. Пасля адказаў малодшыя школьнікі падбіраюць самі параўнанні да слоў *лугі, палі*,

Репозиторий ГрГМУ

*стагі*, адзначаюць лепшыя адказы. Настаўнік можа прапанаваць вучням скласці дома апавяданне «Мой край» з выкарыстаннем падабраных параўнанняў, кожнае з якіх толькі ў тым выпадку будзе ўяўляць каштоўнасць, калі яно народзіцца ў вучня з патрэбнасці выразіць, перадаць яркую карціну.

Пачатковая школа не ставіць перад сабой мэты даць вучням тэарэтычныя звесткі пра сродкі выразнасці мовы. Уся праца носіць практычны характар і падпарадкоўваецца сістэме развіцця маўлення. Асноўнымі прыёмамі працы з'яўляюцца наступныя: знаходжанне ў тэксце вобразных слоў і выразаў; тлумачэнне іх значэння; практыкаванні ў падборы метафар, параўнанняў, эпітэтаў; слоўнае маляванне, узнаўленне вобраза па апісанні ў тэксце; уключэнне вобразных сродкаў у пераказы, сачыненні.

Такім чынам, сістэматычная і мэтанакіраваная праца над тропамі дапамагае настаўніку фарміраваць вобразнае маўленне вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.


**Літаратура:**

1. Старычонак, В. Д. Беларуская мова : шк. слоўнік-даведнік / В. Д. Старычонак. – Мінск, 2002. – 367 с.
2. Телия, В. Н. Метафоризация и ее роль в создании языковой картины мира / В. Н. Телия // Роль человеческого фактора в языке. Язык и картина мира. – М. : Наука, 1988. – С. 183–204.


## НЕЎМІРУЧЫ ВОБРАЗ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯЎЧЫНЫ


**Лукшына Ю.В.,**
студэнтка 1 курса лячэбнага факультэта

УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.


Прыгажосць штодзень побач з намі. Але ў кожнага чалавека сваё разуменне прыгожага. Кожны з нас не аднойчы быў зачараваны ёю.

А што такое прыгажосць? Гэта, напэўна, тое, што вабіць, радуе душу, цешыць вока.

Жыццёвая прыгажосць знаходзіць адлюстраванне ў літаратуры. А. П. Чэхаў пісаў: *"У чалавека павінна быць усё прыгожым: і твар, і адзенне, і душа, і думкі"*.

Уяўленні аб прыгажосці жанчыны ў розныя гістарычныя эпохі былі рознымі.

Бандароўна прыгожая, і прыгажосць яе рамантычная, амаль казачная, незвычайная. Можа, гераіня незямная? Для чаго аўтар паэтызуе выгляд гераіні? Як ствараў Янка Купала гэты вобраз, як сам адносіўся да сваёй гераіні і якія пачуцці выклікаў у нас?

Бандароўна – дачка казака Бандарэнкі з мястэчка Берастэчка, натура ўзвышаная, вытанчаная. Прыгажосцю дзяўчыны захапляецца сам паэт: